УДК 7.036:069.9:378«1967»(476.5)

# Першая справаздачная выстава твораў мастакоў-педагогаў. Віцебск 1967 год

***Цыбульскі М. Л.***
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава", Віцебск*

*Артыкул прысвечаны Першай справаздачнай выставе твораў мастакоў-педагогаў Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава, якая адбылася ў 1967 годзе ў гарадской выставачнай зале і 50-гадовы юбілей якой адзначае ў гэтым годзе мастацка-графічны факультэт. Захаваўся не толькі выдадзены зусім не вялікім накладам каталог, які быў складзены тагачасным загадчыкам кафедры малюнка і жывапісу, старшым выкладчыкам Р. Клікушыным, але і ўспаміны ўдзельнікаў гэтай выставы, асобныя творы з той экспазіцыі. Абапіраючыся на іх, аўтару ўдалося рэканструяваць не толькі агульную творчую атмасферу, якая панавала ў тыя гады на мастацка-графічным факультэце падчас правядзення выставы, але і некаторыя аспекты педагагічнай і творчай дзейнасці яе ўдзельнікаў. Усё гэта стала падставай для аналізу месца дадзенай выставы ў гісторыі мастацка-графічнага факультэта і выставачнай практыцы яго выкладчыкаў.*

***Ключавыя словы:*** *мастацка-графічны факультэт, Віцебскі педагагічны інстытут імя С. М. Кірава, справаздачная выстава, Віцебская школа акварэлі, мастакі-педагогі, жывапіс, акварэль.*

*(Искусство и культура. – 2017. – № 4 (28). – С. 5–13)*

# First Accounting Exhibition of Works by Artist Teachers. Vitebsk 1967

***Tsybulski M. L.***
*Educational Establishemnt "Vitebsk State P. M. Masherov University", Vitebsk*

*The article centers round First Accounting Exhibition of works by artist teachers of Vitebsk State Pedagogical S. M. Kirov Institute which took place in 1967 at the City Exhibition Hall, and the 50th anniversary of which is celebrated by the Art Faculty. Not only the catalogue, which was published in a few copies and was compiled by the then Head of Department of Drawing and Painting, senior lecturer R. Klikushin, is extant but also memoirs of the Exhibition participants as well as some exhibited works. On their basis the author managed to restore not only the general creative atmosphere, which reigned in those years at the Art Faculty during the Exhibition but also some aspects of pedagogical and artistic activities of its participants. All this became the basis for the analysis of the place of the exhibition in the history of the Art Faculty and the exhibition practice of its teachers.*

***Key words:*** *Art Faculty, Vitebsk State Pedagogical S. M. Kirov Institute, Accounting Exhibition, Vitebsk school of water color, artist teachers, painting, water color.*

*(Art and Cultur. – 2017. – № 4 (28). – P 5–13)*

Пад гучным ідэалагічным слоганам "Насустрач 50-годдзю савецкай улады" ў красавіку 1967 года ў віцебскай гарадской выставачнай зале, што знаходзілася ў той час на скрыжаванні вуліц Леніна і Савецкай, адбылася Першая справаздачная выстава твораў мастакоў-педагогаў Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава. Захаваўся і выдадзены зусім не вялікім накладам (100 экзэмпляраў) каталог, які быў складзены тагачасным загадчыкам кафедры малюнка і жывапісу, старшым выкладчыкам Р. Клікушыным [1]. Уступны артыкул да каталога быў напісаны мастацтвазнаўцам Генадзем Лебедзевым, які ў той час у вышэй прыгаданым інстытуце выкладаў гісторыю мастацтва [2].

"Наколькі я памятаю, выставы з удзелам выкладчыкаў і студэнтаў мастацка-графічнага факультэта праводзіліся пачынаючы з 1965 года, – узгадваў адзін з удзельнікаў выставы 1967 года Леанід Анцімонаў падчас нашай з ім размовы 20 год таму, калі аўтар гэтага артыкула пачынаў пісаць

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: mtsybulsky@rambler.ru – М. Л. Цыбульскі*



Репозиторий ВГУ

яго, даследуючы дадзеную тэму. – Гэта былі шматлікія перасоўныя выставы, якія вандравалі па раёнах Віцебскай вобласці. Але ў 1967 годзе ўпершыню выстава адбылася на такой адказнай пляцоўцы, у цэнтры горада Віцебска. У дадзенай экспазіцыі прымалі ўдзел усе вядучыя выкладчыкі мастацка-графічнага факультэта, а галоўнае – самая актыўная яго частка – моладзь... Упершыню да выставы мастакоў-педагогаў рыхтаваўся да друку афсетным спосабам у Віцебскай друкарні каталог. Мне здаецца, каталог не паспеў да адкрыцця выставы і быў выдадзены крыху пазней, але, безумоўна дадаў «вагі» і значнасці гэтай падзеі" [3]. Яшчэ адзін удзельнік выставы Іван Хіцько ўспамінаў: "На адкрыцці выставы прысутнічаў вядомы віцебскі тэатральны мастак, галоўны мастак Беларускага тэатра імя Я. Коласа Яўген Нікалаеў, які на той час быў старшынёй Віцебскага аддзялення Саюза мастакоў СССР. Гэта было сведчанне асаблівай увагі да нас з боку Саюза мастакоў, ды і сама экспазіцыя ў цэлым выглядала даволі прадстаўніча..." [2].

Мэта артыкула – прааналізаваць асаблівасці арганізацыі і правядзення Першай справаздачнай выставы твораў мастакоў-педагогаў Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава, якая адбылася ў 1967 годзе, агульную творчую атмасферу, што панавала ў тыя гады на мастацка-графічным факультэце і некаторыя аспекты педагагічнай і творчай дзейнасці ўдзельнікаў выставы.

**На мастацка-графічным факультэце.** 1967 год у гісторыі краіны быў юбілейны – шырока адзначалася 50-годдзе савецкай улады. Напярэдадні свята Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Маскве 4 лістапада планавалася ўрачыстае адкрыццё Усесаюзная мастацкая выстава. Гэта быў год знакавы і ў сэнсе рэспубліканскіх мастацкіх падзей: у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР была запланавана выстава "Мастакі Беларусі – 50-годдзю Кастрычніка". Па часе выстава мастакоў-педагогаў папярэднічала ўсім гэтым юбілейным урачыстасцям. І тым не менш, ва ўступным артыкуле да каталога Першай справаздачнай выставы твораў мастакоў-педагогаў, мастацтвазнавец Генадзь Лебедзеў адзначаў: "Фактам арганізацыі сваёй першай справаздачнай выставы калектыў мастакоў-педагогаў мастацка-графічнага факультэта Віцебскага пэдінстытута ўсклаў на сябе вельмі адказную і высакародную задачу: не толькі ўнесці важкі ўнёсак у развіццё культурнага жыцця нашага горада, але і аднавіць на новай аснове традыцыі той значнай ролі, якую адыгрывалі паслядоўна мастацкія навучальныя ўстановы Віцебска ў развіцці беларускага савецкага мастацтва" [1, с. 3]. Нягледзячы на тое, што ў канцы 60-х гадоў адносіны да мастацтва авангарда былі яшчэ зусім не станоўчыя, для аўтара тэксту каталога было даволі смелым крокам працягваць ланцужок і вызначаць сувязь паміж адкрытай у Віцебску ў 1918 годзе Народнай мастацкай школай, рэарганізаванай у 1923 годзе ў мастацкі тэхнікум, а затым – у мастацкае педвучылішча, і існуючым у той час мастацка-графічным факультэтам пэдінстытута.

З 1964 па 1970 г. адну з вядучых кафедраў на мастацка-графічным факультэце – кафедру малюнка і жывапісу ўзначальваў Рыгор Клікушын. "Прапанова заняць пасаду загадчыка кафедры, – узгадваў ён, – для мяне была як снег на галаву. Я ніколі і нідзе не праяўляў схільнасці да адміністравання, ці кіраўніцтва калектывам, да таго ж членам партыі не быў. Але кіраўніцтва пераканала мяне у тым, што я спраўлюся з гэтай працай. Безумоўна, спачатку я быў у разгубленасці, не ведаў, за што ўзяцца. Выкладчыкі па-рознаму падтрымлівалі мяне – маўляў, не богі гаршкі абпальваюць. (...) Рэктарат ішоў насустрач і дапамагаў. З яго дапамогай мне ўдалося прыцягнуць на кафедру маладых мастакоў" [4].

Сапраўды менавіта ў гэты час значна абнавіўся і ўзмацніўся склад выкладчыкаў мастацка-графічнага факультэта. У 1963 годзе прыйшлі выкладаць Леанід Анцімонаў, Вікенцій Ральцэвіч і Анатоль Кавалёў, у 1964 – Яўген Красоўскі, у 1965 – Альберт Някрасаў, у 1966 – Алег Арлоў, Аляксандр Гаўрушка і Іван Хіцько, у 1967 – Фелікс Гумен. Маладыя, сапраўды апантаныя творчасцю мастакі, былі выпускнікамі розных вышэйшых навучальных устаноў, у тым ліку і мастацка-графічнага факультэта ВДПІ імя С. М. Кірава (сучасны ВДУ імя П. М. Машэрава). У сваім дзённіку, узгадваючы прыход новага пакалення выкладчыкаў, падзеі таго часу, атмасферу, што панавала ва ўніверсітэце, Клікушын пісаў: "Паседжанні кафедры праходзілі вельмі бурна. Абмяркоўвалі самыя розныя пытанні і шмат спрачаліся... Творчасці надавалася асаблівая ўвага" [5]. Іван Хіцько ўзгадвае: "Калі на мастацка-графічны факультэт прыйшлі выкладаць Вікенцій Ральцэвіч і Яўген Красоўскі, у іх майстэрні было сапраўднае паломніцтва. Іх манера вольнага, шырокага жывапісу была асабліва прыцягальнай для маладых мастакоў. Я ўжо не кажу пра Фелікса Гумена, за яго творчасцю студэнты сачылі асабліва пільна, стараліся наведваць усе выставы з яго ўдзелам" [2].

Сябрамі Саюза мастакоў у 1967 годзе былі толькі Р. Клікушын і В. Ральцэвіч, а І. Сталяроў і Ф. Гумен былі кандыдатамі ў сябры Саюза.

Рэпазіторый ВДУ

Нягледзячы на гэта, выкладчыкі мастацкіх дысцыплін на факультэце прымалі актыўны ўдзел у абласных і рэспубліканскіх выставах.

**Тэматыка твораў.** На выставе мастакоў-педагогаў былі прадстаўлены жывапіс, графіка і скульптура. У каталожным артыкуле адзначаецца, што асноўную масу твораў складае жывапіс (творы алеем і акварэллю), у якім прысутнічае "шырата ахопу тэматыкі" і "разнастайнасць жанраў". Пры ўласцівай савецкаму часу не вызначальнай, "дзяжурнай" ролі артыкула ў дадзеным каталозе, што праявілася ў выкарыстанні некаторых даволі распаўсюджаных у тыя гады мастацтвазнаўчых штампаў у апісанні экспазіцыі, Г. Лебедзеў, тым не менш, не змяняе сваім прынцыпам і спрабуе дакладна вызначыць асаблівасці творчай манеры практычна кожнага з удзельнікаў гэтай выставы.

Адразу кідаецца ў вочы амаль што поўная адсутнасць на выставе падкрэслена ангажыраванага мастацтва, палітычных, сацыяльна арыентаваных тэм. У экспазіцыі пераважаюць пейзажы, партрэты, нацюрморты. "Што датычыцца тэм, то тут не можа быць адназначнага адказу. Хоць у параўнанні з абласнымі і рэспубліканскімі выставамі ў нашай экспазіцыі ідэалагічнага мастацтва было не шмат. У некаторых мастакоў падобная тэматыка магчыма сапраўды ішла ад душы, ад шчырай, часам «сляпой веры» ў светлыя ідэалы. А іншыя падыходзілі да гэтага інакш. Безумоўна, з такімі творамі лягчэй было трапіць на выставу, так цябе маглі хутчэй адзначыць у друку" [3].

**Акварэлі ў экспазіцыі выставы.** У 1960-я гады пры самым непасрэдным удзеле выкладчыкаў мастацка-графічнага факультэта ў Віцебску набірала моц акварэльная школа [6] і таму не заўважыць гэтага ў экспазіцыі аналізуемай выставы проста немагчыма. Гэта адбывалася не толькі дзякуючы метадычна-паслядоўнай працы сталага на той час выкладчыка акварэлі Сталярова, але, ці не ў першую чаргу, дзякуючы творчай актыўнасці маладых акварэлістаў – Ф. Гумена і В. Ральцэвіча.

Сярод традыцыйна невялікіх па памерах акварэльных аркушаў, што прадставіў на дадзенай выставе Іван Сталяроў былі як пейзажы, так і некалькі тэматычных кампазіцый. У Івана Сталярова (20.05.1923, г. Віцебск – 27.09.2015, г. Магілёў) на той час за плячамі былі не толькі вучоба ў Віцебскім (1939–1940) і Мінскім мастацкіх вучылішчах (1951), на факультэце графікі Маскоўскага паліграфічнага інстытута (1960), але і праца выкладчыкам Віцебскага мастацка-графічнага педагагічнага вучылішча (1951–1958). На мастацка-графічным факультэце ён выкладаў з самага пачатку яго заснавання. Як і Ф. Гумен і В. Ральцэвіч, Іван Сталяроў стаяў ля вытокаў шырокавядомай Віцебскай школы акварэлі [6], паколькі ў першую чаргу з'яўляўся аўтарам спецыяльных вучэбных праграм, дапаможнікаў, у якіх была сістэматызавана методыка працы акварэльнымі фарбамі.

У экспазіцыі былі прадстаўлены краявіды І. Сталярова "Мястэчка", "Пасля дажджу", "Возера Селішчава", "Вёска Рыбакі", віцебскі пейзаж "Юр'ева горка", эскіз кампазіцыі "Сельская лазня", "Гара Бештаў". У каталожным артыкуле Г. Лебедзеў падкрэслівае традыцыйны характар пейзажных матываў у творчасці мастака і "насычаныя тоны серабрыстага каларыту" ў яго творах. Са створанай мастаком у 1963–1965 гг. нізкі "Браслаўшчына", Сталяровым была паказана эпічная па характару пейзажная кампазіцыя "Браслаўшчына. Возера Струста".

На выставе І. Сталяроў паказаў і некалькі новых акварэльных аркушаў з нізкі "Па партызанскіх сцежках", над якой ён працаваў амаль што на працягу ўсяго свайго жыцця. З гэтага цыклу і акварэль "Возера Селішчава", пра якую ўзнёсла пісаў аўтар-складальнік каталога [1, с. 4]. Мастак адлюстроўвае былыя партызанскія мясціны ў іх сённяшнім выглядзе. Як выразны вобразны ўспамін пра перажытае, пра партызанскае мінулае гучыць эскіз кампазіцыі "На пабыўцы", што таксама быў прадстаўлены ў экспазіцыі.

Яўген Красоўскі разам з Вікенціем Ральцэвічам экспанаваў на выставе акварэлі з мінулагодняй вандроўкі па Далёкім Усходзе. Мастакі пешшу прайшлі па Камчатцы, дасягнулі краю мацерыка. Яўген Красоўскі (07.05.1937, г. Ярцава Смаленскай вобл., Расія – 30.11.2004, г. Віцебск) вучыўся разам з А. Арловым у Рыжскай мастацкай вучэльні імя Я. Разенталя (1958), а потым скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (1964). Амаль на працягу дзесяці гадоў выкладаў жывапіс і кампазіцыю на мастацка-графічным факультэце (1964–1973).

Акварэльныя творы, якія Красоўскі прадставіў у экспазіцыі, вылучаліся экспрэсіўнай жывапіснай пластыкай, выразнымі кантрастамі і, разам з тым, лірычнай узнёсласцю. Імкненне глыбей распрацаваць тэму паспрыяла з'яўленню арыгінальных кампазіцыйных рашэнняў. Спробы абагульніць ўражанні садзейнічалі з'яўленню ў экспазіцыі эскізаў і некалькіх алейных твораў, такіх як "Вулкан" і "Краноцкі заліў".

Сярод работ, што экспанаваў Вікенцій Ральцэвіч, былі як беларускія краявіды

Рэпазіторый ВДУ

“Беларускі пейзаж”, “Вясновы пейзаж”, так і краявіды Далёкага Усходу (“Камчацкі пейзаж”, “Бераг Ціхага акіяна”, “Даліна гейзернай ракі”). Апошнія творы – уражанні ад творчай вандроўкі на Далёкі Усход. “Мне добра запомнілася гэта паездка В. Ральцэвіча, – узгадваў І. Хіцько, – бо менавіта дзякуючы ёй я і застаўся на выпускным курсе без кіраўніка, якім быў прызначаны А. Ральцэвіч” [2]. Своеасаблівай падачай вобразаў, жывапіснай выразнасцю і лаканізмам вылучаліся партрэты, што былі напісаны В. Ральцэвічам.

Вікенцій Ральцэвіч (20.01.1936, в. Гарбавічы Чавускага р-а Магілёўскай вобл.) прыехаў у Віцебск пасля заканчэння спачатку Мінскага мастацкага вучылішча імя А. Глебава (1957), а пазней Беларускага дзяржаўнага тэатрально-мастацкага інстытута (1963). Праца на кафедры выяўленчага мастацтва Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава (1963–1970) была ў біяграфіі вольнага творцы ўсяго толькі непрацяглым эпізодам, але прыкметным для студэнтаў і школы ў цэлым. “Вікенцій Ральцэвіч у сваіх акварэлях заўжды прыцягваў студэнтаў сваім усведамленнем ролі кампазіцыі. Сярод віцебскіх акварэлістаў у той час ён асабліва “выбудоўваў” кампазіцыю, не спадзяваўся на яе рэальныя канкрэтныя прататыпы” [3].

У прадстаўленых у экспазіцыі творах Фелікса Гумена мастацтвазнавец Г. Лебедзеў адзначае “ўменне давесці кантрасты таноў да відавочнай мяжы, не губляючы пры гэтым галоўнай якасці акварэлі – празрыстасці, цякучай пераліўчатасці плямаў” [1, с. 6]. У гэтых творах Ф. Гумена добра бачны жанравыя прыярытэты мастака, што вызначыліся ўжо на пачатку яго творчай дзейнасці. Нацюрморт і пейзаж сталі тымі жанрамі, у якіх голас мастака гучыць у поўную моц. І хоць пісаў у сваім жыцці Ф. Гумен таксама партрэты і нават тэматычныя кампазіцыі, але здаецца нідзе не быў такім натуральна гарманічным у вобразна-стылістычным плане, як у нацюрморце і пейзажы: нідзе так выразна не праявілася яго жывапіснае майстэрства, каларыстычнае бачанне свету, як у гэтых двух жанравых формах. Пры гэтым мастак аддае перавагу пленэрным, натурным матывам.

Прыкметна, што акварэль “Наваполацк” з матывам сонца, што паўстае над маладым горадам, настолькі ўразіла мастацкіх крытыкаў і журналістаў, а да таго ж так дакладна адлюстроўвала перыяд новабудоўляў маладых гарадоў, што яе не аднойчы друкавалі і нават зрабілі ў той час своеасаблівым сімвалам творчасці Ф. Гумена. Дамінуючай у творчасці мастака ў той час станавілася і тэма Віцебска. Першыя віцебскія пейзажы былі прадстаўлены яшчэ на студэнцкай выставе 1960 года, а на выставе 1967 года была акварэль “Віцебск”.

Фелікс Гумен (28.03.1941, в. Кальцова Амурскай вобл., Расія) скончыў Віцебскі педагагічны інстытут імя С. М. Кірава (1962), дзе вучыўся ў В. Дзежыца, Д. Генеральніцкага, І. Сталярова. Дыпломная праца Ф. Гумена стала своеасаблівым прарывам на шляху зацвярджэння акварэлі як паўнавартаснай жывапіснай тэхнікі. Выступаючы па выніках абароны тагачасны загадчык кафедры Валянцін Дзежыц раптам сам прапанаваў будучым дыпломнікам выконваць свае працы ў любой тэхніцы. Гэта была “адліга” ў жыцці і ў мастацтве, да якой Фелікс Гумен меў самае непасрэднае дачыненне. Пэўны час Фелікс Гумен жыў ў Наваполацку, дзе працаваў выкладчыкам малявання, вёў гурток па выяўленчаму мастацтву. З захапленнем займаўся творчасцю з дзецьмі, вадзіў іх на эцюды, дзе заўсёды маляваў і сам. “І акварэльнай манатыпіяй Фелікс пачаў займацца сапраўды раней за мяне, – узгадваў Леанід Анцімонаў, сапраўдны знаўца, тэарэтык і практык манатыпіі. Праўда рабіў гэта спантана, не надаваў гэтаму асаблівага значэння. Мяне ж зацікавіла асаблівa тэхналогія” [3].

Вяртанне Фелікса Гумена ў Віцебск і пачатак працы на мастацка-графічным факультэце Віцебскага педінстытута супадаюць з годам правядзення выставы педагогаў. Малады, творча настроены настаўнік спадабаўся студэнтам, магчыма, таму, што ён ніколі не быў высакамерным, дзяліўся сакрэтамі сваёй тэхнікі, уласнымі знаходкамі са сваімі вучнямі. А каб прадэманстраваць той ці іншы акварэльны прыём, Фелікс Гумен не спадзяваўся на славесныя тлумачэнні, а браў у рукі пэндзаль і маляваў. Гумен займаўся са студэнтамі не толькі ў інстытуцкіх аўдыторыях, але шмат працаваў і на пленэры, падтрымліваў эксперыментатарства. Сваёй актыўнай творчай, экспазіцыйнай дзейнасцю мастак таксама прыцягваў да сябе ўлюблёную ў мастацтва моладзь.

На час правядзення выставы выкладчыкаў імя Фелікса Гумена было ўжо добра вядома ў мастацкіх колах. “За плячамі” ў мастака быў удзел у вельмі прадстаўнічых выставах (Першая Усесаюзная выстава акварэлі, Масква (1965); Выстава беларускіх мастакоў, Парыж, Марсэль (1965); Рэспубліканская выстава твораў мастакоў Віцебскай вобласці, Мінск (1966); Першая рэспубліканская выстава акварэлі, Мінск (1966). Ужо раннія працы Фелікса Гумена былі адзначаны мастацкай грамадскасцю, як новая, неардынарная з’ява.

Рэпазіторый ВДУ

На звыклым фоне акварэльных натурных эцюдаў своеасаблівыя творы Гумена ўражвалі сваёй жывапіснасцю, арыгінальнасцю каларыстычных рашэнняў, незвычайнымі кампазіцыйнымі прыёмамі. “Гумен валодае бяспрэчным майстэрствам”, – адзначае тагачасны друк [7]. У гэты перыяд мастак упарта “змагаецца” за сваё ўласнае бачанне свету, за права на эксперымент, за сваю ўласную манеру ў акварэлі. “Успамінаю свае раннія акварэлі, – кажа Фелікс Гумен. Нахабства было больш чым пачуццяў...” [8].

Нацюрморты ўяўляюць жывапісную тэму вялікай колькасці твораў Ф. Гумена. У экспазіцыі 1967 года былі прадстаўлены “Нацюрморт”, “Яблыкі”, “Нацюрморт з керамікай”. Назваць нават асноўныя іканаграфічныя варыянты нацюрмортаў Гумена, як і акрэсліць асноўныя тэмы у іх, наўрад ці магчыма. Дыяпазон аб’ектаў у яго нацюрмортах надзвычай шырокі: мастак неабыякавы да самых розных матэрыяльных форм, звычайных побытавых рэчаў. Былі ў экспазіцыі і нацюрморты з кветкамі (“Нацюрморт з кветкамі”, “Кветкі шыпшынніку”). Гумен не аднойчы падкрэсліваў: “Я бясконца люблю кветкі, у іх столькі загадкавага. Калі малюю іх, хочацца перадаць не толькі колер, каларыт, але і стан. Хочацца, каб яны ажылі і задыхалі” [9]. Святло быццам бы пранізвае матэрыю твораў Фелікса Гумена. Выразныя, празрыстыя шматколерныя рэфлексы на шырока напісаных, надзвычай пластычных рэчах, гароднiне і садавіне ўзмацняюць напружаныя кантрасты колеру, гучанне яркіх сакавітых фарбаў. Невыпадкова ў мастака шмат кампазіцый напісана пры яркім сонечным асвятленні, нацюрмортаў, пастаўленых на фоне акна, дзе светлавы паток найбольшы.

**Графіка і алейны жывапіс.** Сёння ўжо можна ўпэўнена сцвярджаць, што “шматабяцальныя пошукі” Леаніда Анцімонава (16.12.1934, в. Куляшы Сенненскага р-на Віцебскай вобл. – 16.02.2012, г. Віцебск), пра якія піша складальнік каталогу, у значнай ступені пазней рэалізаваліся. У экспазіцыі першай выставы выкладчыкаў была акварэльная манатыпія Леаніда Анцімонава “Снежныя віхуры”. З гэтага твора практычна і пачалася праца Анцімонава ў галіне манатыпіі, пра што з гумарам апавядаў аўтару дадзенага артыкула сам мастак: “Быў я ў 1966 годзе ў Сянно, пісалі мы там эцюды. Адзін з іх крыху сапсаваўся. Шчыра кажучы, не вельмі ён мне падабаўся ўвогуле. А таму папырскалі мы на яго вадой і пачалі таптаць. А потым так атрымалася, што Гумен паглядзеў на напісанае на эцюдах і сказаў: “Усё дрэнь, а вось гэту працу мы возьмем на маладзёжную выставу”. Але з той выставы ў Мінску гэта манатыпія, на жаль, да мяне не вярнулася...” [3]

Сярод прыгадваемых крытыкай акварэляў Анцімонава ў экспазіцыі быў рамантычна ўзнёслы пейзаж “Лясная казка”, паэтычны краявід “Наша Дзвіна” і акварэль на гістарычную тэму “Ноч у 1941 годзе”. Леанід Анцімонаў у творах таго часу паўстае як апантаны эксперыментатар і імправізатар. І разам з тым прыхільнік лепшых рэалістычных традыцый. Пасля заканчэння жывапіснага аддзялення Рыжскай вучэльні прыкладнога мастацтва, мастацка-графічнага факультэта педінстытута ў 1963 годзе Леанід Анцімонаў пачаў тут сваю педагагічную дзейнасць ужо ў якасці выкладчыка жывапісу, малюнка і кампазіцыі. А ўласная творчасць стала не толькі вольнай праявай яго апантанай мастацтвам душы, але і “эксперыментальным полем”, напрацоўкі ў якім пачалі выкарыстоўвацца ў працы са студэнтамі.

Ужо пазней на мастацка-графічным факультэце Леанідам Анцімонавым будзе створана з нуля графічная майстэрня, у якой амаль 35 гадоў ён будзе займацца вывучэннем і ўдасканаленнем магчымасцяў традыцыйных графічных тэхнік, адкрываючы пры гэтым новыя. Яго студэнты займаліся не толькі афортам, літаграфіяй і дрэварытам, але і дыятыпіяй, фларатыпіяй, гравюрай на кардоне, фанеры і ДВП, выкарыстоўвалі камбінаваныя тэхнікі, калажны спосаб гравюры. Але манатыпія стане своеасаблівай “візітоўкай”, творчым крэда гэтага мастака. “Манатыпія для мяне стала сапраўднай знаходкай і адкрыццём, – кажа Леанід Анцімонаў. Гэта і не графіка і не жывапіс, а цалкам самастойны від мастацкай практыкі” [3]. У пошуках найбольшай мастацкай выразнасці сваіх манатыпій мастак звычайна выконваў дзясяткі варыянтаў адной і той кампазіцыі, эксперыментаваў з разнастайнымі сумясямі фарбаў і разбаўляльнікаў, выкарыстоўваў розныя прылады, вялікую колькасць фактур, розныя тэхнічныя прыёмы друку. Мастак ведаў больш за 30 прыёмаў манатыпіі, ім былі распрацаваны шэраг варыянтаў акватыпіі (атрымання адбіткаў з паверхні вады), прынцыпы манатыпіі акварэльнымі, алейнымі і друкарскімі фарбамі. Не выпадкова ім былі падрыхтаваны і выдадзены шэраг навучальных дапаможнікаў па графіцы, манатыпіі, гравюры на кардоне (дзве часткі), фларатыпіі.

Некалькі невялікіх па фармату манатыпій (“Ракета”, “Космас”, “Аўтапартрэт”) Алы Гумен (1941 г., пазней Ала Баклан), што былі ў экспазіцыі выставы 1967 года, прадставілі



Репозиторий ВГУ

гэту мастачку (а неўзабаве і выкладчыка), а на той час старшага лабаранта, даволі вольным эксперыментатарам. Музычнасць рытмаў і асаблівую выразнасць адзначае Генадзь Лебедзеў у яе кампазіцыі “Космас”, падкрэслівае блізкасць яе да малюнкаў М. Чурлёніса, і пры тым піша, што “незвычайнасць тэхнікі выканання дае права бачыць у гэтай працы арыгінальны плён удумлівай творчасці мастачкі” [1, с. 6].

Для многіх, хто сёння ведае выдатнага даследчыка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі Івана Хіцько і яго практычную творчую дзейнасць у гэтай галіне, удзел мастака ў выставе 1967 года з жывапіснымі творамі можа падацца сапраўднай навінай. Іван Хіцько (07.07.1939 в. Дуброва Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл.) у 1961 годзе скончыў мастацка-графічны факультэт ВДПІ імя С. М. Кірава і застаўся выкладаць ва ўніверсітэце.

Пейзажныя кампазіцыі, што былі на выставе 1967 года і якія мастак захаваў да сённяшніх дзён, выразна адлюстроўваюць час і творчыя прыярытэты мастака ў тыя гады. Вылучаючы ў акварэлях мастака “пачуццё непасрэднасці, своеасаблівы настрой індывідуальнага ўспрымання прыроды”, Г. Лебедзеў адзначае, што ў невялікіх пейзажах, у малюнках акварэллю камернага характару “мастак дасягае значнага майстэрства” [1]. Сярод пейзажаў, што напісаны акварэллю, у экспазіцыі былі прадстаўлены “Цёплы вечар”, “Верасень”, “Пахмурны дзень”, “Вусце Заходняй Дзвіны”. Цікавасць уяўляюць і два акварэльныя нацюрморты, якія мастак прадставіў у экспазіцыі. Асобнай размовы патрабуюць алейныя эцюды Івана Хіцько. У іх ён асабліва непасрэдны і вельмі паэтычна настроены (“Восень”, “У лесе”, “На Дзвіне”).

Аб новых прыёмах жывапісу Алега Арлова (18.07.1934, в. Старасакольнікі Пскоўскай вобл. – 22.04.1995, г. Віцебск) узгадвалі як наведвальнікі выставы, так і крытыка, якая ў тыя часы пісала, аб “упэўненай мадэліроўцы формы, лаканічнасці вобразаў”, “экспрэсіі, унутранай дынаміцы, вастрыні задумы” ў творах А. Арлова. “ Пра Алега Арлова я ведаю, ці не больш за усіх, – казаў Л. Анцімонаў. Ён быў маім добрым сябрам. Мы разам вучыліся ў рамесніцкай вучэльні № 17 на аддзяленні альфрэйшчыкаў-маляроў вышэйшай кваліфікацыі. Праўда я ўжо заканчваў вучобу, а Арлоў толькі паступіў вучыцца. Пасля я паступіў у вучылішча прыкладнога мастацтва ў Рызе (імя Я. Разенталя), куды праз некалькі гадоў прыехаў вучыцца і Алег Арлоў. Так што жыццё наша доўгі час праходзіла побач. Гэта быў сціплы, але вельмі старанны ў адносінах да мастацтва чалавек. Ён любіў літаратуру, сачыў за сучаснымі напрамкамі ў развіцці мастацтва” [3].

Мала хто ведае, што Алег Арлоў як патомны марак паступаў у марскую вучэльню, і спадзяваўся звязаць свой лёс з морам. Але не склалася. Спачатку ён скончыў Рыжскае мастацкае вучылішча імя Я. Разенталя (1958), а пазней Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (1966). Вучоба ў інстытуце спрыяла адточванню майстэрства, але не змагла змяніць культуры каляровага ўспрымання, якая сфарміравалася яшчэ ў Латвіі і аказалася нібы спраецыраванай на ўсю далейшую творчасць мастака. Алег Арлоў любіў складаныя рытмы ў жывапіснай плоскасці, адводзіў асноўную ролю колеравым кантрастам і эфектнай пластыцы. Нават, здавалася б, у ангажыраваных сюжэтах мастак выяўляў на дзіва яркія якасці жывапісца, пераўтвараючы сацыяльна знакавы матыў у экспрэсіўна арганізаваны каларова-пластычны струмень.

Шэраг фігуратыўных кампазіцый, што былі прадстаўлены на выставе Алегам Арловым, на той час асістэнтам кафедры, звярталі ўвагу на своеасаблівае каларыстычнае бачанне рэальнасці, дынамічную манеру пісьма, эмацыйную выразнасць і эксперыментальны характар яго твораў. Падобная стылістыка, безумоўна, вылучала гэтага маладога мастака на фоне сфарміраванай тут жывапіснай школы. Нягледзячы на свой невялікі памер, творы Арлова выглядалі кампазіцыйна завершанымі. Гэта датычыцца ў першую чаргу эскізаў, пазней напісаных мастаком карцін “Канцлагер” і “Клятва байцоў”. “Я памятаю гэтыя творы, – адзначае І. Хіцько. Яны былі напісаны шырокімі плоскасцямі, і выглядалі вельмі свабоднымі і эфектнымі” [2]. І канешне ж, уражвалі гледачоў партрэтныя эцюды. Гэта і эцюд “Скрыпач”, і пастэльны эцюд “Жаночы партрэт”, і “Аўтапартрэт”. Сярод пейзажных твораў Арлова ў экспазіцыі быў прадстаўлены эцюд “Ускраіна горада”.

Сёння імя Алега Арлова і яго дзейнасць практычна забытыя. Да трагічнага лёсу самога мастака, які аслеп і памер ў самым росквіце творчых сіл, дадаўся трагічны лёс яго жывапіснай спадчыны. Так здарылася, што з досыць вялікай колькасці твораў, напісаных Алегам Арловым, захаваліся адзінкі. І самая вялікая калекцыя твораў гэтага цудоўнага каларыста, апантанага эксперыментатара і бязмерна ўлюбёнага ў жывапіс чалавека, відавочна, знаходзіцца ў мастацкай галерэі г. Полацка.

Яшчэ адзін экспанент выставы мастакоўпедагогаў – Альберт Някрасаў. У экспазіцыі

Рэпазіторый ВДУ

былі прадстаўлены яго эскізы мазаічных пано (“Спорт”, “Космас”) і, на наш погляд, адна са знакавых кампазіцый гэтага мастака “Чаканне”. Невыпадкова гэты твор з’яўляўся пазней на рэспубліканскіх выставах і быў апублікаваны ў часопісах. У значнай ступені ў кампазіцыі “Чаканне” знайшлі адлюстраванне ўласцівыя творчасці і жывапіснай манеры мастака рамантычнасць, дэкаратыўная абагульненасць формаў, стрыманая жывапісная гама, лаканізм.

Альберт Някрасаў (20.04.1937, в. Красавіна Верхаваўжскага р-на Валагодскай вобл., Расія – 22.09.1992, г. Віцебск) прыехаў выкладаць у Віцебск па запрашэнні свайго сябра Л. Дзягілева пасля заканчэння Яраслаўскай мастацкай вучэльні (1959) і Ленінградскай вышэйшай мастацка-прамысловай вучэльні імя В. Мухінай (манументальнае аддзяленне) (1965). Першапачаткова працаваў на мастацка-графічным факультэце Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава (1965–1977), а пазней перайшоў на працу на аддзяленне мастацкага канструявання вырабаў лёгкай прамысловасці Віцебскага тэхналагічнага інстытута (1977–1992). Як жывапісец працаваў у станковым і манументальным жывапісе, манументальна-дэкаратыўным мастацтве. Многія калегі Някрасава адзначалі яго працавітасць і апантаную улюбёнасць у сваю працу, у мастацтва.

Многія сведкі тых гістарычных падзей узгадвалі, што творы асістэнта кафедры Паўла Арцёмава (1936) у экспазіцыі вылучаліся сваёй жывапіснай манерай. Мастак прыехаў працаваць у Віцебск пасля заканчэння Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. На выставе ён экспанаваў як свае алейныя творы (“Над Лучосай”, “Партрэт”), так і малюнкі вуглём (“Дзяўчына”). Акрамя эцюдаў з натуры, Павел Арцёмаў прадставіў і даволі вялікае палатно – эскіз тэматычнай карціны “Працоўныя будні”, у якім мастацтвазнаўцы адзначалі “нядрэнныя жывапісныя якасці, якія перадаюць настрой бадзёрасці і жыццярадаснасць працаўнікоў” [1, с. 6]. Пісалі таксама, што “многае ў эскізе сведчыць пра тое, што зроблены ўжо плённыя спробы перадачы індывідуальных рыс вобраза, канкрэтызацыі іх характараў”. Леанід Анцімонаў, узгадваючы Паўла Арцёмава адзначаў, што той “меў добрую адукацыю, і мог навучыць многаму сваіх вучняў, працы якіх дагэтуль упрыгожваюць сцены МГФ” [3].

Выключна лінарыты прадставіў на выставе Рыгор Клікушын (04.12.1921, в. Сладкова Маслянскага р-на Цюменскай вобл., Расія – 12.02.2014, г. Віцебск). Мастак пераехаў у Віцебск у 1946 годзе, паступіў тут на гістарычны факультэт педагагічнага інстытута, а ў 1950 годзе пачаў выкладаць гісторыю ў мастацка-графічнай педагагічнай вучэльні (сучасны мастацка-графічны факультэт). Праз шэсць гадоў скончыў мастацкае аддзяленне Маскоўскага завочнага паліграфічнага інстытута (1956 ) і працягнуў выкладанне ў недінстытуце ў 1959 годзе на мастацка-графічным факультэце.

На справаздачнай выставе 1967 года былі шырока вядомыя сёння творы мастака – “Вярба”, “Вясна”, “Канчатковы прыпынак”, “Лучоса зімовая”, “Пейзаж з сонцам”, “Восень”. Лінарыт як тэхніка займае цэнтральнае месца ў творчасці Р. Клікушына. Мастак, як адзначае гэта і мастацтвазнавец Г. Лебедзеў, абапіраецца ў сваёй творчасці “на традыцыі класічнай еўрапейскай ксілаграфіі” і, разам з тым, выкарыстоўвае ў сваіх лінарытах не заўжды ўласцівыя гэтай тэхніцы на той час прыёмы. І гэта сапраўды, “не скоўвае майстра, а, насупраць, дае магчымасць разнастаіць і ўдасканальваць прыёмы гравіроўкі, ствараць выявы па-сучаснаму рамантычныя” [1, с. 7]. Першапачаткова ён ставіў задачу аваладаць гравюрай на лінолеуме, а потым выпрабаваць іншыя падыходзячыя матэрыялы. Але ж з таго моманту, як ён захапіўся лінагравюрай, ужо “не мог ні аб чым іншым думаць і займацца чым-небудзь іншым. Тэхніка гравюры на лінолеуме захапіла мяне цалкам”. Пераважна ўсе гравюры Клікушына, за малым выключэннем, выкананы ў штрыхавой манеры. “Адбілася мая звычка маляваць пяром і карыстацца штрыхом. Гэтага ў мяне не адняць, гэта ўжо на ўсё маё творчае жыццё” [10].

Краявіды ваколіц Віцебска, паэтычныя замалёўкі са штодзённага жыцця горада – вось асноўны накірунак вобразаў у лінарытах Клікушына. У значнай большасці гравюр і замалёвак мастака быццам бы жыве дух таго ўзнёслага і рамантычнага часу, калі яны былі створаны. Немагчыма не адзначыць уласцівыя лінарытам Клікушына падкрэслены дынамізм жывапіснага штрыха і вытанчаную стрыманасць графічнай мовы.

У экспазіцыі былі і напісаныя алеем адносна невялікія па фармату (у сярэднім 30х40 см) нацюрморты Сямёна Далматава. Мастак (1923, в. Беламестнае Нова-Сахалінскага р-на Белгародскай вобл. – 1999, г. Віцебск) прыехаў працаваць у Віцебск пасля заканчэння Маскоўскага гарадскога педагагічнага інстытута (1950). Ужо значна пазней ён стане вядомы як мастацтвазнавец і асабліва ўважлівы даследчык графікі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Рэпазіторый ВДУ

У сваіх нацюрмортах, прадстаўленых на выставе 1967 года, С. Далматаў прадэманстраваў, як “тонкі мастацкі густ і задушэўную лірычнасць адносін да натуры” [1]. Яго творы “Флоксы”, “Нацюрморт з садавінай” адрозніваліся дасканалай распрацаванасцю формы, пластычнай завершанасцю. Сучаснікі прыгадвалі гармонію каларыстычнай пабудовы ў нацюрморце Далматава “Ліпа квітнее”, кампазіцыі “У ціхім завулку”. На час правядзення выставы Сямён Далматаў працаваў старшым выкладчыкам кафедры, але пазней увайшоў у гісторыю мастаца-графічнага факультэта, як адзін з загадчыкаў кафедры выяўленчага мастацтва (1970–1976).

Аляксандр Гаўрушка экспанаваў на выставе васямнаццаць зусім невялікіх па памерах эцюдаў у тэхніцы алейнага жывапісу. Мастак (1927, г. Магілёў – 1995, г. Віцебск) у 1955 годзе скончыў мастацкі інстытут у Вільнюсе, а ў 1966 г. пачаў выкладаць на мастацка-графічным факультэце. Прадстаўленыя мастаком творы “Восень”, “Вясна”, “Восень у парку”, “Вечар пасля дажджу”, “Вечар у вёсцы”, “Зіма”, “Сонечны дзень”, “Увосень у лесе”, “Жыта ў пахмурны дзень”, “Зіма ў лесе”, як і шэраг твораў пад назвай “Эцюд”, напісаны ў падкрэслена рэалістычнай манеры, прыхільнікам якой заўжды быў мастак. У кожным з іх відавочна імкненне творцы перадаць непаўторны характар і стан прыроды. Таксама на выставе А. Гаўрушка паказаў і невялікія па памерах партрэтныя кампазіцыі (“Галава маці”, “Партрэт мужчыны”), якія, таксама як і эцюды пейзажаў, выкананы на кардоне.

“Аляксандр Гаўрушка быў вельмі высокаадукаваным чалавекам, – узгадваў Леанід Анцімонаў. Выхаванец установы, якая пазней стала Акадэміяй мастацтваў, ён добра разумеў і разбіраўся ў мастацтве. Увогуле ў яго было нейкае прыроднае адчуванне гармоніі. Магчыма, тут адыгралі сваю ролю арыстакратычныя карані. Ён цудоўна ведаў творы імпрэсіяністаў і асабліва быў улюбёны ў іх мастацтва. Гэта быў вельмі тэмпераментны, прамы і шчыры чалавек, таму нярэдка і сутыкаўся з вялікай колькасцю праблем” [3].

Шэраг жывапісных і графічных твораў прадставіў на выставе Васіль Шаталаў (1923, в. Сярэдні Карачан Верхне-Карачанскага р-на Варонежскай вобл. – 1997, г. Віцебск), які прыехаў выкладаць у Віцебск пасля заканчэння Мінскай мастацкай вучэльні (1952). Напярэдадні выставы, пра якую мы вядзём гаворку, ён скончыў Маскоўскі паліграфічны інстытут (1963). Магчыма, менавіта таму ў экспазіцыі былі яго пераважна графічныя творы (аўталітаграфіі, малюнкі), сярод іх малюнкі, выкананы літаграфскім спосабам (“Масква”, “Партрэт”). Як піша мастацтвазнавец, яны “сведчылі пра несумненае майстэрства Шаталава-малявальшчыка” [1, с. 7]. Не менш цікавымі былі і тры жывапісныя эцюды, напісаныя алеем. На час правядзення выставы В. Шаталаў – старшы выкладчык кафедры, але пазней ён стане дэканам мастацка-графічнага факультэта і на гэтай пасадзе будзе з 1968 па 1980 г.

На выставе экспанаваліся таксама творы Анатоля Кавалёва. Мастак (10.05.1926, в. Даўгаполле Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. – 18.01.2015, г. Віцебск) працаваў у Віцебскім педінстытуце выкладчыкам з 1963 года пасля заканчэння Вышэйшага мастацка-прамысловага вучылішча імя В. Мухінай у Ленінградзе (1958). На час выставы ён загадваў настворанай кафедрай дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (1965–1976). Але на той час кафедра мела іншую назву – кафедра працы і дэкаратыўна-прыкладнага мастацтва. Яна была створана на мастацка-графічным факультэце ў 1965 годзе ў адпаведнасці з Пастановай урада пра адраджэнню мастацкіх рамёстваў і вывучэнню яго асноў у агульнаадукацыйных школах.

Як мастак-жывапісец А. Кавалёў працаваў пераважна ў станковым жывапісе, таму на выставе было нямала невялікіх па памерах эцюдаў алеем: сярод іх “Восень”, “Зіма”, “Снежань”, “Кіпарысы”, “Ялта”, “Раніца ў Ялце”, “У Гурзуфе”, “Скала Айвазоўскага”, “Марсава поле”, “Фантанка”, “Эцюд”, “Пасля дажджу”, “Рака Ціса”, “Бярозкі”. Генадзь Лебедзеў крытычна адзначае няраўназначнасць прадстаўленых эцюдаў. Гэта ў нейкай ступені нават дзіўна, бо менавіта эцюды найбольш выразна прадстаўляюць жывапіснае майстэрства гэтага мастака. У экспазіцыі таксама былі і малюнкі алоўкам з натуры (“Маці”, “Ульянаўск. Порт”) і некалькі дэкаратыўных медальёнаў з гіпсу ў тэхніцы нізкага рэльефа з адлюстраваннем ленінскіх мясцінаў г. Ульянаўска.

**Скульптура.** Скульптурныя партрэты ў экспазіцыі выставы 1967 года былі прадстаўлены Дзмітрыем Генеральніцкім. Мастак (1911, г. Умань, Чаркескай вобл. – 1972, г. Віцебск) у тым жа годзе, што і С. Далматаў скончыў Маскоўскі гарадскі педагагічны інстытут (1950), але на мастацка-графічным факультэце пачаў працаваць ўжо ў 1959 годзе. Асоба старшага выкладчыка Д. Генеральніцкага для студэнтаў у той час была адметнай. “Яго асабліва любілі студэнты, бо любіў ён расказваць пра мастакоў, многіх з якіх, па яго словах, добра ведаў асабіста. Яго скульптуры былі



Рэпазіторый ВДУ

даволі прафесійныя, «правільныя» і, разам з тым, зробленыя недзе на мяжы самадзейнага і прафесійнага мастацтва" [3].

Сярод твораў, якія мастак прадставіў на выставе 1967 года, былі як натурныя партрэты ("Выкладчык педінстытута А. Патапенка", "Рацыяналізатар Г. Ермашкевіч" і інш.), так і работы, у якіх архітыпічныя вобразы былі выкананы пераважна па ўяўленню ("Піянер", "Выкладчык", "Настаўнік", "Каваль", "Яфрэйтар"). Імкненне стварыць тыповы вобраз не перашкаджаў мастаку ўважліва і дакладна ўвасабляць канкрэтныя партрэтныя рысы персанажа. Асноўным матэрыялам для твораў Генеральніцкага, безумоўна, быў гіпс. Сярод партрэтных бюстаў быў і праект помніка ўраджэнцу Віцебска, Герою Савецкага Саюза, камандзіру стралковай роты, старшаму лейтэнанту Уладзіміру Свідзінскаму (20.05.1923 – 25.03.1945). Ён ў гады Вялікай Айчыннай вайны здзейсніў сапраўдны подзвіг (верасень, 1943 г.) пры фарсіраванні Дняпра.

**Заключэнне.** Абапіраючыся на дакументы, матэрыялы друку, успаміны ўдзельнікаў Першай справаздачнай выставы твораў мастакоў-педагогаў, работы што былі прадстаўлены ў экспазіцыі, аўтару дадзенага артыкула ўдалося рэканструяваць не толькі агульную творчую атмасферу, якая панавала ў тыя гады на мастацка-графічным факультэце падчас правядзення выставы, але і некаторыя аспекты педагагічнай і творчай дзейнасці яе ўдзельнікаў. Усё гэта стала падставай для аналізу месца дадзенай выставы ў гісторыі мастацка-графічнага факультэта і выставачнай практыцы яго выкладчыкаў.

Такім чынам, Першая справаздачная выстава твораў мастакоў-педагогаў Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава, якая адбылася ў 1967 годзе ў гарадской выставачнай зале, стала значнай падзеяй як для гісторыі віцебскай мастацкай школы ў цэлым, так і канкрэтна для развіцця практыкі справаздачных выстаў выкладчыкаў мастацка-графічнага факультэта. Дадзеная экспазіцыя ўпершыню прадставіла віцебскаму гледачу творчасць абноўленага складу выкладчыкаў факультэта, большасць сярод якіх складала моладзь. Гэта выстава падкрэсліла ролю Віцебскай мастацкай школы ў развіцці мастацтва нашай краіны і, безумоўна, значэнне мастацка-графічнага факультэта педінстытута для яе ўмацавання і развіцця. Цікавасць, якую праявіла тагачаснае кіраўніцтва Саюза мастакоў СССР, сведчыла аб асаблівай ўвазе, якую надавалі прафесійныя мастакі дзейнасці віцебскіх мастакоў-педагогаў. Не выпадкова ў тым жа 1967 годзе яшчэ трое выкладчыкаў І. Сталяроў, Ф. Гумен і Я. Красоўскі сталі сябрамі Саюза мастакоў. Упершыню да выставы мастакоў-педагогаў быў падрыхтаваны каталог. У далейшым практыка арганізацыі выстаў выкладчыкаў была працягнута, акрамя таго выкладчыкі мастацкіх дысцыплін на мастацка-графічным факультэце пачалі ўсё больш актыўна прымаць удзел не толькі ў абласных і рэспубліканскіх, але і ў міжнародных экспазіцыях і праектах.

### ЛІТАРАТУРА


1. Первая отчётная выставка художников-педагогов Витебского государственного педагогического института им. С. М. Кирова. Каталог. – Витебск, Типография им. Коминтерна, 1967. – 16 с.
2. Успаміны Хіцько. Запісаны аўтарам артыкула 20.10.2017.
3. Успаміны Анцімонава. Запісаны аўтарам артыкула ў 1997 годзе.
4. Клікушын, Р. «Мяне адлучылі ад віцебскай мастацкай школы...» / Р. Клікушын; апрац. тэксту і пер. М. Цыбульскі // Вечерний Витебск. – 1996. – 6 дек. – С. 3.
5. Дзённік Клікушына. Уласнасць сям'і мастака.
6. Віцебская школа акварэлі / Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / гал. рэд. Г. П. Пашкоў.– Мінск.: БелЭН, 1997. – Т. 4 – С. 225
7. Заборaў, М. Напісана акварэллю / М. Забораў // Літаратура і мастацтва. – 1966. – 27 сн.
8. Бойка, У. Што можа акварэль / У. Бойка // ЛіМ. – 1969. – 27 ліп.
9. Цыбульскі, М. Феликс Гумен: Мой Лёс акварэль / М. Цыбульскі [Электронны рэсурс]. – 200. – Рэжым доступу: http://gumen.na.by/data/biogr.htm. – Дата доступу: 15.04.2017.
10. Інтэрв'ю з Рыгорам Клікушыным. Запісана аўтарам артыкула 28.11.2009.


*Паступіў у рэдакцыю 25.09.2017 г.*

Репозиторий ВГУ